# «Што ні вёсачка — то журавінка»

**Быў у Злучаных Штатах Амерыкі, Аўстраліі, захапляўся вадаспадам Вікторыя на поўдні Афрыкі і біблейскім Вавілонам у Іраку, крочыў па рысавых чэках Кітая, блукаў па гарах Іспаніі, Чарнагорыі... Нястомны вандроўнік, журналіст Уладзімір Субат, які ўсё жыццё прысвяціў расповедам пра беларускія вёскі, шчыра прызнаецца, што нідзе ў свеце не знаходзіў таго цяпла, такога ж ветлага сонца, як над Беларуссю. А калі дакладней — над яго родным Палессем. Журналісцкі досвед працы ў тэлепраграмах, прысвечаных нястомным хлебаробам, пошук адметных герояў у беларускай глыбінцы выліўся ў кнігі. Уладзімір Паўлавіч — аўтар паэмы «Столінская вандроўка», а не так даўно ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшаў яго грунтоўны зборнік партрэтаў-інтэрв'ю «Вытокі». Пра жыццё ў вандроўках, супрацьстаянне сям'і і прафесіі, а таксама любоў да працы і шчымлівыя моманты шчырасці з героямі — гутарка з Уладзімірам СУБАТАМ.**



***— Зазвычай людзі імкнуцца «збегчы» з райцэнтра ці вёскі ў сталіцу, наладзіць свой побыт у гарадской кватэры, а вясковы дом выкарыстоўваць толькі ў якасці лецішча. У вас жа атрымліваецца ўсё наадварот — фактычна ўсё жыццё жывяце ў Мінску, але і сёння большасць часу бавіце ў родных мясцінах, у палескім Століне...***

— Не ведаю, добра гэта ці кепска, але пупавіна, што звязвае з вёскай, не перасохла. Для мяне маці, вёска і Беларусь — тоесныя. Тая любоў да роднай зямлі, што далі бацькі, — найдаражэйшая. Кожны раз як на крылах лячу з Мінска ў вёску. У сталіцы жыву амаль паўвека, але здаецца, жыццё тут — як побыт у інтэрнаце, мой дом у палескай глыбінцы, дзе нястомна бурліць няўрымслівая рака Гарынь. Калі заходжу ў вясковую хату і адчуваю пах хлеба, малака, разумею: гэта маё, роднае. Гэтыя пахі — лепшыя за ўсялякія французскія духі. Хіба можа не кранаць водар зямлі, які адчуваеш, ідучы па вясновай раллі? Я пабудаваў мур на дзедавай сядзібе ў Століне. Душою там адпачываю. Калі ажывае вясновы сад, здаецца вось-вось з-за квітнеючых дрэў выйдзе маці, пачне касіць лугавіну бацька. Сям'я пярэчыла: усе будуюцца каля Мінска, а я — амаль за 400 кіламетраў. І амаль штопятніцы сядаю ў цягнік і імчу 7 ці 8 гадзін у родныя мясціны. Там жа карані! Ды і з суседзямі люблю пагутарыць, яны мяне таксама чакаюць і радуюцца прыездам. Там заўжды цікава і найлепш пішацца.

***— Ваша новая кніга, дзе сабраныя інтэрв'ю з рознымі людзьмі, мае досыць сімвалічную назву — «Вытокі». Чаму абралі менавіта гэтае слова?***

**«Вялікае шчасце — расказваць пра людзей, якіх любіш, асабліва калі яны жывуць на дарагой табе зямлі».**

— Кожны песціць свае вытокі. Гэта тое патаемнае, святое, што ёсць у кожнага ў сэрцы. Варта націснуць на тую «кнопачку», знайсці ключ, каб іх адкрыць. Для мяне вялікае шчасце — адкрываць вытокі ў кожнага з герояў, знаходзіць глыбіннае. Важна таксама, каб табе яго даверылі.

***— Ці лёгка вам людзі адкрываюцца? Маеце сакрэты даверлівых гутарак са сваімі героямі?***

— Дабіцца таго, каб герой распавядаў пра сябе, як на споведзі ў храме, — найвышэйшая вяршыня прафесіяналізму любога журналіста. Беларусы шчырыя і адкрытыя, да іх трэба толькі таксама шчыра ставіцца. Самы просты сакрэт — я ніколі ні перад кім не «малююся», які ёсць — такі ёсць. Такі мой масток да чалавека. Заўсёды ў сваім героі імкнуся знайсці нейкія рысы, каб ім можна было захапіцца, палюбіць іх. Прыгадваецца: гутару аднойчы з даяркай, яна ў гумавых ботах, рукі парэпаныя. Гляджу — якія ў яе прыгожыя сінія вочы — як азёры. А другая бабуля з хойніцкай вёскі Глінішча — 98 гадоў, яе сын сябраваў з Іванам Мележам. Калі ўвайшоў у хату, яна на печы цыбулю перабірала. Павіталася, злезла — і я ўбачыў яе постаць царыцы. Уявіў, якой прыгажуняй была ў маладосці! Здараюцца і вельмі незвычайныя гісторыі, знаёмствы. Гэтая ж бабуля з Глінішча расказала, якой прыгожай была паляшучка, што стала прататыпам мележаўскай Ганны Чарнушкі. Аказалася, што яна яшчэ жывая. Знайшоў яе сядзібу на ўскрайку вёскі Каранёўка. Была зіма. Заходжу ў двор, а перад сенямі ляжыць гара напілаваных дроў. З акна паглядае бабулька. Як толькі ўбачыў яе твар — адразу пазнаў мележаўскую гераіню. Адзінае, што на твары адбіліся павуцінкі часу. Гаспадыня выйшла з хаты, паспрабаваў загаварыць, пазнаёміцца, а яна адразу: што знаёміцца, няма каму дровы пакалоць. Я не доўга думаў, узяў сякеру і ўзяўся за справу. А потым завязалася гутарка. І я ў той момант не «красаваўся», сапраўды хацеў дапамагчы састарэлай сялянцы, адразу ўявіў, як сваім унукам буду расказваць пра сустрэчу з такой цікавай асобай.



Падчас канферэнцыі ў Брэсце, пачатак 1990-х.

***— Атрымліваецца, што тыя вытокі, якія жывяць нашу нацыю, яднаюць мінулае і сучаснасць, яшчэ можна адшукаць у беларусах?***

— Так. І гэта не толькі матэрыяльныя рэчы. Прыехаў аднойчы ў Смаргонь, на радзіму Францішка Багушэвіча. У музеі ўбачыў крэслы, на якіх сядзеў некалі пісьменнік. Вельмі хацеў да іх дакрануцца, але не наважыўся. Пазней пазнаёміўся са смаргонскімі сялянкамі, якія да таго ж выдаліся галасістымі пявуннямі. Іх самабытныя спевы кранали душу. У голасе жанчын гучала тая самая магічная мелодыка, якую чуў і якой натхняўся Багушэвіч! Кожная мясціна ў Беларусі валодае пэўнай магіяй, яна кранае, няма куточка, які нельга не палюбіць.

***— Але ж мы кажам пра сучасную вёску, тут лад жыцця паступова змяняецца, гэта не тое традыцыйнае беларускае грамадства.***

— Сапраўды, сённяшняя вёска — не патрыярхальная, яна сучасная. Напрыклад, часта прыязджаю ў Альшаны, вядомы аграгарадок на Палессі. Амаль дзесяць тысяч жыхароў, дзве сярэднія школы. Альшаны на вачах пашыраюцца, як цеста ў дзяжы прыбывае. Памятаю, там некалі жыла выдатная жанчына Параска Шут, на партыйных з'ездах у Маскве ў прэзідыуме сядзела побач з кіраўнікамі вялікай дзяржавы. Была вядомай ільнаводкай у пасляваенныя гады, сябравала з Іосіфам Броз Ціта і перапісвалася з яго жонкай. Была знаёмая з Брэжневым. Калі згарэла альшанская царква, людзі пачалі будаваць новую. Параска па лесвіцах падымала вёдры з цэментам пад самы купал. Ёй было 92! Я запытаўся, адкуль такая энергія? Яна адказала, што ад Бога...

***— А ў вашай працы здараліся выпадкі, калі нават жыццю пагражала небяспека?***

— Аднойчы сярод ночы выйшаў з цягніка і пакуль агледзеўся, што не мая станцыя, састаў ужо адыходзіў. Ледзьве паспеў ускочыць на прыступкі апошняга вагона. Пачаў грукаць у шкло, а тым часам поезд набіраў хуткасць... Толькі цудам мой грукат пачулі пасажыры, паведамілі праваднiку, і ён адкрыў дзверы вагона. Імгненне вырашыла мой лёс. А неяк у вясновае разводдзе здымалі праграму пра жыццё адрэзанага ад свету вадой вострава Куба, што ў Столінскім раёне. Бурлівая Гарынь заліла ўсё навокал. Нашу лодку, на якой мы дабіраліся на Кубу, ледзьве не перавярнулі магутныя крыгі. Калі б гэта здарылася — наўрад ці выбраліся б з вады самі. У народзе кажуць: як Бог дасць — то і ў акно падасць. Тады сам не будзеш ведаць, адкуль што бярэцца. Гэта праўда. Мне заўсёды шчасціла і шчасціць, думаю, у тым ліку таму, што я раблю справу ад чыстага сэрца для Бацькаўшчыны. Маці-Беларусь адгукаецца і сама нібыта высцілае шлях.

***— Бачна, што праца прыносіць задавальненне і вам самому. А можа, творыце перш за ўсё дзеля сябе?***

— Напэўна, усё ж у першую чаргу дзеля сябе. А сабе ж кепска не зробіш. Нават бліны паіншаму пячэш: сабе патэльню тлусцей памажаш *(смяецца)*. Кожны раз, калі працую над матэрыялам — нібыта складаю ліст да маці. А ёй не схлусіш. Калі дадасі нешта ад сябе — як людзям у вочы глядзець будзеш? Вялікае шчасце — расказваць пра людзей, якіх любіш, асабліва калі яны жывуць на дарагой табе зямлі. Часам, калі працую, азіраюся, ці няма каго побач. Ад лёсаў герояў слёзы засцяць вочы. Перажываю за іх, як за сябе. Я ж мужчына, але ў той момант жыву тым, пра што пішу, і бывае так балюча! Нібыта са мной гэта адбываецца. Думаю таксама, як пакласці гісторыю на паперу так, каб яна кранула не мяне, а чытача. Бо не той гумар важны, калі апавядальнік сам смяецца, а калі рагочуць слухачы.

**«Раней, калі выбіраў паміж журналістыкай і сям'ёй, на першае месца ставіў прафесію. Сёння радуюся: якое шчасце, што ўвечары маю магчымасць сустракацца з унукамі, бавіць з імі час».**

***— За столькі гадоў працы, напэўна, уздоўж і ўпоперак аб'ехалі Беларусь нават некалькі разоў. Ці ёсць мясціны, дзе вы яшчэ не былі?***

— Не быў толькі ў адным беларускім горадзе — Лоеве. Мару туды з'ездзіць. Для мяне кожны горад мае сваю прыгажосць. Мёры — як беларуская Ялта, прыгожы высачэнны касцёл і набярэжная ўздоўж возера. Мазыр, Петрыкаў, Быхаў, Навагрудак! А Слонім з тэатрам і прыгажуняй-Шчарай. Які гарадок ні вазьмі, нават самы маленькі, — Дзісну — ён нечым адметны. А Лынтупы, Відзы пад Паставамі! Што ні вёсачка — то журавінка.

***— Як шукаеце сваіх герояў?***

— Спецыяльна ніколі не шукаю. Неяк самі «выплываюць», часам зусім нечакана. Ужо падчас першай сустрэчы, першага погляду ў вочы героя разумееш — матэрыял атрымаецца ці не. Няма цяпла ў позірках — справа не пойдзе. Так, у Слуцкім раёне жыве глухі і сляпы Мікалай Амельяновіч, у якога цудоўны свой сад. Яму амаль 80, пражыў жыццё без сям'і. Ён спачатку зусім не ішоў на кантакт. Але я разумеў, што не маю права пра яго не сказаць, бо мужчына адраджае сарты слуцкай бэры. З-за соляў, што распаўсюджваецца ў паветры каля калійнага камбіната, грушы сталі гінуць. Але гэты садоўнік іх адраджае. Мне прыемна, што я ўсё ж вярнуўся да яго. Доўга мы размаўлялі з Мікалаем Дзмітрыевічам у Слуцкім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе ён зараз знаходзіцца, і ўсё ж знайшлі агульную мову. Кажуць, кожны чалавек — гэта ненапісаны раман. І гэта праўда.

**«Ужо падчас першай сустрэчы, першага погляду ў вочы героя разумееш — матэрыял атрымаецца ці не. Няма цяпла ў позірках — справа не пойдзе».**

***— Вы з такім захапленнем распавядаеце пра гераінь. Жонка не раўнуе? Як ставіцца да такой апантанай працы?***

— Усяго было! Нават да развода ледзь не дайшло. Не кожная жанчына вытрымала б жыццё побач з такім заўзятым вандроўнікам. Але мая жонка разумее, што працоўны дзень журналіста амаль не ўнармаваны. Я ні разу яе ў радзільны дом не праводзіў, пра нараджэнне дачок даведваўся па тэлефоне — у камандзіроўках. Не бачыў, як раслі дзеці, усе клопаты былі на плячах жонкі. Я ёй вельмі за гэта ўдзячны. Часам і папракала, не прымала маю апантанасць працай, але, думаю, разумела, што я быў заняты забеспячэннем сям'і. Цяпер, калі маю ўнукаў, я сам пачынаю разумець каштоўнасць сям'і. Раней, калі выбіраў паміж журналістыкай і ёй, на першае месца ставіў прафесію. Сёння радуюся: якое шчасце, што ўвечары маю магчымасць сустракацца з унукамі, бавіць з імі час. І вялікая радасць, калі сям'я разам.

***— Пісаць пра вёску — досыць складана і вельмі адказна. Каго з пісьменнікаў можаце назваць мэтрам гэтай справы?***

— Не так даўно перачытваў раман «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага і быў проста ў захапленні, як гэты творца ўмее падбіраць словы, як будуе тэкст, адлюстроўвае падзеі. Чорны настолькі глыбока пісаў пра беларускую вёску, што кожнаму журналісту, які пачынае працаваць у гэтым кірунку, варта павучыцца ў яго. Пісьменнік любіў вёску, так трапна пра яе пісаў, вымалёўваў вобразы, праз філасофію, думкі паказваў партрэты сялян 1930-х гадоў. Гэта вельмі цікава. Мы, журналісты, — таксама летапісцы. Зараз няма яркіх пісьменнікаў-сучаснікаў, аддадзеных вясковай тэме. Значыць мы павінны гэтую задачу ўзяць на сябе. Несці гісторыю беларускай вёскі, занатоўваць яе для наступных пакаленняў. Думаю, мае будучыя героі яшчэ мяне чакаюць.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

**Фотаздымкі з архіва Уладзіміра СУБАТА.**



У вёсцы Палессе Чачэрскага раёна, студзень 1997 года.